*Т.В.Паздзеева*

## Псіхолага-педагагічныя асновы фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый студэнтаў

У сучасных умовах ажыццяўляецца далейшае развіццё сістэмы вышэйшай адукацыі. Сфера ўздзеяння вышэйшай адукацыі на асобу расшыраецца. Менавіта ў гэтым праяўляецца прагрэс цывілізацыі, пад"ём грамадскай актыўнасці народных мас.

Разам з ростам значэння свядомасці ў жыцці -- ведаў, культуры, маральных арыенціраў -- узрастае роля настаўніка, яго ўдзелу ў матэрыяльным і культурным развіцці грамадства, у фарміраванні маральнага аблічча народа, новага разумення маральных каштоўнасцей, паводзінскіх ідэалаў. Вышэйшыя навучальныя педагагічныя установы павінны так рыхтаваць будучых педагогаў, каб яны валодалі прафесійным майстэрствам, мелі такое грамадзянскае маральнае аблічча, якое дазволіла б ім унесці адчувальны ўклад у ажыццяўленне маральных каштоўнасных арыентацый.

Уся сістэма педагагічнай адукацыі імкнецца цесна аб"яднаць маральныя якасці, ідэалы, прынцыпы маралі з грамадскай і прафесійнай практыкай, што магчыма толькі на базе шырокіх ведаў. Гэтыя веды, адзінства навучання і выхавання дазваляюць рэалізаваць прынцыповыя патрабаванні да маральна-этычнага выхавання.

Будучыя настаўнікі ўжо з"яўляюцца сфарміраванымі асобамі. Яны выбралі прафесію і вызначылі напрамак жыццёвага шляху, мэты маральнага выхавання. Маральныя каштоўнасныя арыентацыі становяцца да іх бліжэй, патрабаванні ўзрастаюць. Задачы маральнага выхавання адпаведна змяняюцца. У сучасных умовах прафесійная адукацыя цесна звязваецца з фарміраваннем маральнай свядомасці і перш за ўсё маральных каштоўнасных арыентацый.

Для студэнтаў маральныя каштоўнасныя арыентацыі не з"яўляюцца ні цвёрда фіксаванай мадэллю, ні кангламератам пэўных якасцей. Маральныя каштоўнасныя арыентацыі, якія фарміруюцца ва ўмовах навучання і творчай педагагічнай дзейнасці, абумоўліваюць разнастайнасць асобных рысау і накіроўваюць іх дзейнасць на высокія калектыўныя мэты.

Маральнае выхаванне студэнцтва служыць падрыхтоўцы і падключэнню яго да той грамадскай дзейнасці, у якой увасабляюцца калектыўныя мэты грамадства. Аднак гэта падрыхтоўка адбываецца не толькі

як духоўнае абагачэнне і не як "асветніцтва".

Толькі ў актыўным дзеянні студэнт набывае маральны вопыт, засвойвае такія маральныя формы свядомасці і пачуццяў, без якіх немагчыма далейшае развіццё. Праўда, да маральных каштоўнасных арыентацый нельга наблізіцца толькі з боку дзейнасці ці толькі з боку маральных якасцей і гэтыя два аспекты не існуюць незалежна адзін ад другога. Шлях да іх ляжыць праз пераўтварэнне рэчаіснасці, што знаходзіцца ў адзінстве з пераўтварэннем самой асобы. Асновай этычнага выхавання з"яўляецца калектыўная дзейнасць; менавіта ў ёй фарміруюцца маральныя каштоўнасці, з яе яны выходзяць і да яе вяртаюцца.

Маральныя каштоўнасныя арыентацыі студэнтаў педагагічных ВНУ - гэта не маральныя утопіі, а аснова рэальных грамадскіх памкненняў і перспектыў. Іх ажыццяўленне мае на ўвазе глыбокія змены ў фарміраванні індывіда, якія закранаюць асобу студэнта і змяняюць яе сутнасць. Студэнт пачынае адчуваць і ўсведамляць маральную гісторыю чалавецтва. Гэта тая стадыя развіцця асобы, якая завяршае яе этычнае развіццё. У працоўнае жыццё ўступае свядомы творца гісторыі, ён прымае на сябе адказнасць за усё, што закранае інтарэсы краіны і народа. Развіццё пачуцця такой дзейснай адказнасці з"ўляецца важнай устаноўкай выхаваўчай працы ў вышэйшых педагагічных навучальных установах. Гаворачы пра маральныя якасці, якія характарызуюць этычныя каштоўнасныя арыентацыі будучых педагогаў, важна аб"яднаць іх з мэтамі грамадскага развіцця. Гэта справядліва, калі мы гаворым пра маральныя якасці вядомых людзей. Гэтыя якасці заўсёды звязаны з прынятымі задачамі і фарміруюцца ў складанай унутранай барацьбе.

Новая гуманістычная мадэль прадстаўляе сілу станаўлення незалежнай дзяржавы. Маладыя настаўнікі ў этычных каштоўнасцях адлюстроўваюць не толькі запаветныя думкі, але і чалавечыя адносіны і справы. Будучае не можа быць толькі далёкай мэтай. Маральныя каштоўнасныя арыентацыі неабходна разглядаць не як пасіўнае чаканне будучага, а як актыўны творчы працэс змены існуючай рэчаіснасці, маральна-этычных адносін, існуючых у наяўнасці.

Маральныя каштоўнасныя арыентацыі выяўляюцца толькі ў паводзінах, калі яны рэалізуюцца ў канкрэтных дзеяннях.

Усё гэта сведчыць пра тое, што задачай маральна-этычнага выхавання з"яўляецца не проста фарміраванне асобных якасцей асобы. Маральная каштоўнасць якасцей вызначаецца ідэалам, які імкнецца ажыц-

цявіць студэнт. Таму яго маральнымі і каштоўнаснымі арыентацыямі з"яўляецца не ідэальная карціна, а дзеянні, якія фарміруюць умовы і саму асобу. У выніку маральныя каштоўнасныя арыентацыі ўзбагачаюцца новым зместам. У сучасных умовах неабходна імкнуцца да таго, каб маладыя людзі навучыліся ўспрымаць рэальнасць як яна ёсць. Патрэбнасць умешвацца ў гістарычны працэс прымушае да праяўлення смеласці і волі ў барацьбе з цяжкасцямі.

Страсная воля зноў і зноў прымушае аналізаваць абставіны, каб на падставе гэтага аналізу выпрацаваць план дзеянняў. Адзінства страснасці і здаровага сэнсу азначае дыялектыку смеласці, якая дае сілы бачыць задачы, якія патрабуюць вырашэння, і цяжкасці, якія трэба пераадолець.

У працэсе маральнага выхавання асабліваe значэнне маюць перспектывы. Пры гэтым маральна-этычнае развіццё зараз адбываецца значна больш інтэнсіўна, чым калі-небудзь. Прадбачанне рэальных перспектыў заўсёды павінна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі выхавальніка. Яно павінна быць сфарміравана ў свядомасці моладзі з разуменнем таго, што гэтыя перспектывы могуць быць ажыццёўлены толькі намаганнямі людзей і пастаяннай барацьбой, г.зн. стаць дзейснымі маральнымі каштоўнаснымі арыентацыямі. Яны не рэалізуюцца самі па сабе, за іх ажыццяўленне трэба актыўна змагацца. Неабходна выхоўваць студэнтаў для рашэння такіх задач, якія часта не маюць мяжы часу. У гэтым працэсе важная роля належыць адзінству рацыянальных, усвядомленых адносін да маральных каштоўнасцей і іх эмацыянальнаму замацаванню і выражэнню. Яно складае змест маральных пачуццяў. Паміж пачуццямі і розумам існуе ўзаемадзеянне: веды ўздзейнічаюць на пачуцці, уплываюць на маральныя сілы не толькі тым, што вызначае іх змест. Асоба фарміруецца ў выніку засваення жыццёвага вопыту і, значыць, тых жа ведаў.

Маральныя пачуцці, адлюстроўваючы аб"ектыўныя адносіны людзей, разнастайныя бакі чалавечых паводзін, у эмацыянальнай форме фарміруюцца ў працэсе жыцця і выхавання студэнта і пад уздзеяннем на яго грамадскіх адносін. Сацыяльнае паходжанне маральных пачуццяў адрознівае іх ад элементарных пачуццяў чалавека, яго рэфлекторных перажыванняў, фізіялагічных адчуванняў, і выступаюць яны не як рэфлекс, а як адзін з бакоў сацыяльнага свету чалавека. У гэтым іх адрозненне ад другіх пачуццяў чалавека. У маральным пачуцці сінтэзаваны эмацыянальныя і рацыянальныя момантн-

ты. Адносіны да свету, да людзей ніколі не бываюць абыякавыя. Гэта заўсёды глыбока эмацыянальныя адносіны.

У залежнасці ад сілы маральных пачуццяў студэнтаў можна раздзяляць на наступныя групы: I) студэнты са слаба развітымі маральнымі пачуццямі; 2) тыя, якія валодаюць маральнымі пачуццямі, але праяўляюць пасіўнасць у адносінах да амаральных паводзін; 3) студэнты з моцна развітымі пачуццямі, якія не вытрымліваюць амаральных паводзін. Мэта выхавання маральных пачуццяў у студэнтаў -- фарміраванне высокіх пачуццяў.

Выхаванне такіх пачуццяў заключаецца не ў супрацьпастаўленні пачуццяў розуму, а ў іх адзінай накіраванасці і ўзаемаабагачэнні, каб у маральным абліччы студэнта не было супярэчнасці.

Станаўленне маральных пачуццяў у адзінстве з рацыянальным засваеннем сэнсу маральных норм і прынцыпаў робіць асобу зацікаўленай у практычным выражэнні таго, што яна лічыць справядлівым і патрэбным. У працэсе маральнага развіцця асобы спачатку фарміруюцца элементарныя этычныя пачуцці, затым на іх аснове -- этычныя паняцці і перакананні, і на іх аснове вырастаюць вышэйшыя маральныя пачуцці, хоць у рэальным працэсе выхавання фарміраванне ўсіх кампанентаў адбываецца ў іх адзінстве, цэласнасці.

*С.А.Адамовіч*

## Нацыянальная культура і нацыянальная самасвядомасць

Нацыянальная самасвядомасць -- гэта пазнанне нацыяй сваёй уласнай сутнасці, сістэма уяўленняў нацыі аб самой сабе, гэта з"ява, якая прадстаўляе сабой суб"ектыўнае адлюстраванне аб"ектыўна існуючых нацыянальных фактараў жыцця грамадства, усведамленне кожным народам свайго нацыянальнага жыцця, узаемаадносін з другімі народамі. Толькі праз самасвядомасць выпрацоўваецца агульная і індывідуальная ацэнка, сацыяльная пазіцыя, актыўныя адносіны людзей як да сваёй сацыяльна-этнічнай